# Тэкставыя заданні на ўроках беларускай мовы ў 5–6 класах

**Л. У. Нячай,**
настаўнік беларускай мовы і
літаратуры вышэйшай катэгорыі
Обальскай сярэдняй школы
імя Героя Савецкага Саюза
З. М. Партновай Шумілінскага раёна

Мэтай выкладання прадмета «Беларуская мова» ў 5–11 класах з'яўляецца фарміраванне ў вучняў сістэмы ведаў пра мову і маўленне, умення выкарыстоўваць усе віды маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо), развіццё інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай і грамадзянскай культуры навучэнцаў. Але маўленчая практыка школьнікаў усё часцей абмяжоўваецца толькі вывучэннем вучэбнага матэрыялу. Пашырэнню моўнага асяроддзя вучняў, а таксама развіццю нестандартнага, творчага мыслення садзейнічае выкарыстанне настаўнікам разнастайных тэкставых заданняў.

Прапанаваць іх вучням мэтазгодна з 5 класа. Рэгулярнае выконванне іх спрыяе развіццю ў навучэнцаў умення дакладна фармуляваць думкі, будаваць звязнае выказванне, рабіць вывады, абапіраючыся на ўласныя назіранні.

Тэкст як узор правільнага маўлення павінен мець выхаваўча-пазнавальны характар і садзейнічаць павышэнню інтарэсу вучняў да беларускай мовы, гісторыі і культуры. Работа з тэкстам здзяйсняецца па этапах. Спачатку настаўнік прапануе навучэнцам незавершаны тэкст або тэкст з прапушчанымі ці лішнімі часткамі, сказамі, словамі. Вучні аналізуюць яго, дапрацоўваюць, самастойна распрацоўваюць заданні або складаюць новы тэкст. На наступным этапе навучэнцы выконваюць заданні пошукавага характару з розных раздзелаў мовазнаўства, складзеных на матэрыяле прапанаванага тэксту.

Усе заданні накіраваны на развіццё ўвагі, творчага мыслення і маўленчай актыўнасці і будуюцца на дыдактычным матэрыяле, які ўяўляе сабой звязны тэкст. Вылучым наступныя групы заданняў.

1. Практыкаванні аналітычнага характару да гатовага тэксту.

Вызначце (знайдзіце) асноўную думку тэксту або частку, у якой даецца пэўнае апісанне і г.д.

Прасачыце залежнасць ужывання пэўных моўных сродкаў ад мэты выказвання і г.д.

Напішыце свой водзыў аб фільме і супастаўце з рэцэнзіямі на яго: адзначце агульнае ў даных тэкстах і іх адрозненні (параўноўваюцца тэксты на адну тэму, але розныя па задуме, жанре, стылі, кампазіцыі і г.д.).

2. Практыкаванні аналітыка-моўнага характару да гатовага тэксту.

Сфармулюйце тэму выказвання, асноўную думку.

Дайце назву тэксту.

Складзіце кампазіцыйную схему тэксту.

3. Практыкаванні на пераапрацоўку гатовага тэксту.

Устаўце ў дадзены тэкст цытаты, якія пацвярджаюць асноўную думку. Выключыце з тэксту лішнія словы або сказы яга (паўтарэнняў). Дапрацуйце тэкст у адпаведнасці з задумай аўтара да больш яскрава выражанага публіцыстычнага стылю і г.д.

4. Практыкаванні па стварэнні новага тэксту на аснове дадзенага.

Выкладзіце падрабязна або сцісла пэўную частку ці ўвесь тэкст. Падрыхтуйце паведамленне на прапанаваную тэму на аснове дадзенага тэксту.

Перабудуйце апавяданне так, каб яно пачыналася з самага цікавага эпізоду.

5. Практыкаванні на стварэнне ўласнага тэксту.

Значнае месца сярод практыкаванняў гэтай групы займаюць пераказы і сачыненні.

Прывядзём прыклады заданняў.

**Тэма «Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа» ў 5 класе.**

1) Устаўце ў дадзены тэкст словы з даведкі ці ўласныя азначэнні.
2) Знайдзіце ў тэксце сказы з аднароднымі членамі. Назавіце аднародныя члены.

Ужо цэлы тыдзень Міхась у піянерскім лагеры. Яму падабаецца тут усё: футбольнае поле, дзе праводзяцца спартыўныя гульні, ракета, з якой можна ўбачыць увесь лагер.

Непадалёку … возера. Міхась падоўгу можа сядзець на … беразе, назіраць за … стракозамі з … крыльцамі, за … вадамеркамі, якія коўзаюцца па гладкай паверхні вады. Часам можна ўбачыць, як вынырне з вады …, … жук-плывунец. Ой, як хочацца Міхасю злавіць прыгажуна! Але ў ваду не палезеш — строга забаронена… . (Т. Тарасава «Аперацыя “Ягадка”») [6].

*Словы для даведкі:* круты, вялікае, цёмна-карычневы, каляровыя, празрыстыя, прыгожы, даўганогі.

3) Адкажыце на пытанні:

♦ Пра што апавядае тэкст? Што хацеў сказаць аўтар?

♦ Якія сказы па мэце выказвання выкарыстаў аўтар?

♦ Якія бываюць сказы па мэце выказвання?

♦ У якім з гэтых сказаў, на вашу думку, ёсць абагульняльнае слова пры аднародных членах?

♦ Што такое абагульняльнае слова пры аднародных членах?

**Прыём «Вучэбны дыялог»**

Адны вучні лічаць, што абагульняльнае слова – гэта такое слова, пры дапамозе якога можна апусціць аднародныя члены і ўставіць гэта слова, і сэнс ад такой замены не зменіцца. Другія што абагульняльнае слова пры аднародных членах – гэта такое слова, якое аб’ядноўвае аднародныя члены агульным сэнсам і абагульняе пералічэнне. А як думаеце вы?

*Пытанні і заданні:*

♦ Знайдзіце сказ з абагульняльным словам пры аднародных членах.

♦ Праверце меркаванні вучняў з вучэбнага дыялога на выбраным сказе з аднароднымі членамі.

♦ Дайце азначэнне, што такое абагульняльнае слова пры аднародных членах.

♦ Зверце свае разважанні з правілам падручніка.

♦ Запішыце сказ з аднароднымі членамі ў сшытак, падкрэсліце абагульняльнае слова і аднародныя члены як члены сказа.

♦ Прадоўжыце тэкст 2–3 сказамі з аднароднымі членамі сказа.

Часта школьнікі запісваюць не ўвесь тэкст, а толькі яго частку або схематычна паказваюць алгарытм яго выканання.

**Тэма «Мастацкі стыль», 5 клас.**

**Заданне.** Прачытайце тэкст. З прапанаваных ніжэй сказаў выберыце тыя, якія павінны быць першым і апошнім у тэксце.

> (1) … . (2) Снег проста увачавідкі асядаў, змрачнеў і адсоўваўся як мага далей ад платоў і прызбаў. (3) Удзень капала са стрэх, паветра вільгатнела, святлела. (4) Ні з таго ні з сяго сярод белага дня галасіста спявалі пеўні, і на пачарнелых сметніках жвава капашыліся вераб'і. (5) На ноч уедліва браўся яршысты марозік, сушыў, сцягваў тонкім празрыстым лядком лужы, ранкам церусіў дробны, як манка, сняжок. (6)… . [2]

1) Усюды ўжо гуляла сапраўдная вясна, цёплая, зялёная.

2) Памаленьку, але з кожным днём усё смялей і ўладарней наступала вясна.

3) Лета сёлета было познім, але паступова брала сваё.

4) Не спяшаючыся, неяк неўпрыкмет падыходзіла восень.

5) Хоць і без жадання, але зіма збіралася адыходзіць.

Вызначце тэму тэксту. Якая яго асноўная думка?

Якія сказы выкарыстоўваюцца і чым яны ўскладнены?

Выберыце 4 словы і стварыце з імі антанімічныя пары.

Вызначце лексічнае значэнне слоў: плот, прызба, страха, сметнік, церусіць.

Выпішыце з тэксту  просты сказ з аднароднымі выказнікамі.

Прывядзём фрагмент урока па тэме «Лексічнае і граматычнае значэнне слова» ў 5 класе.

На этапе замацавання новага матэрыялу вучні працуюць з карткамі ў парах.

**Заданне.** Уважліва прачытайце тэкст. Карыстаючыся тлумачальнымі слоўнікамі і кнігай М. Маляўкі «Сядзіба, або Хата з матчынай душою», растлумачце лексічнае значэнне выдзеленых слоў і ўкажыце на граматычнае.

**Картка 1.** Багач – старажытнае свята заканчэння ўборкі **зерневых,** ***водгук*** **язычніцкага** свята земляробчага ***культу*** **Дажджбога**, «бога сонца, багацця і дастатку». Адзначалася ў дні, якія стаяць блізка да **асенняга раўнадзенства**. У некаторых раёнах лічылася першым днём восені.

Багачом або багатцам называлі таксама кошык з жытам і свечкаю. Яго на свята насілі ў кожную хату і ***адрыну.*** Зерне ў кошык збіралі з першага зажыначнага снапа, свечку рыхтавалі пад спеў дажынкавых мелодый.

**Картка 2.** Згодна ***павер 'ям***, **Багач** забяспечваў сям'і дабрабыт і шчасце. На Багача да ўсходу сонца гаспадар засяваў ніву жытам, асвечаным яшчэ ў першую **Прачыстую**. «Прыйшоў Багач – кідай ***рагач***, бяры ***сяваньку,*** сей памаленьку». Да свята стараліся скончыць **касавіцу**. Асенняе свята добра прадстаўлена прыказкамі: «Багач заткнуў застраху рагач», «У **стагнача** хопіць хлеба да Багача».

1. Растлумачце значэнне прыказак, запісаных на дошцы.
2. Выпішыце 3 словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае.
3. Выпішыце з тэксту 2 дзеяслоўных словазлучэнні і 2 назоўнікавых.
4. Выпішыце просты сказ і зрабіце сінтаксічны разбор.
5. Сфармулюйце ўласнае заданне да практыкавання.
6. Падрыхтуйце паведамленне на тэму «Багач – свята ўраджаю».

Заданне павышанай цяжкасці. Знайдзіце ў тэксце словы, у якіх блізкія лексічныя значэнні, а граматычныя – адрозніваюцца. *(Дастатак – багацце.)*

**Фрагмент урока па тэме «Поўныя і кароткія якасныя прыметнікі» ў 6 класе.**

На этапе вывучэння новага матэрыялу настаўнік прапануе сфармуляваць праблемнае пытанне.

Якасныя прыметнікі маюць дзве формы – поўную і кароткую. Чым яны адрозніваюцца, якія адметныя асаблівасці кароткіх прыметнікаў, якая іх сінтаксічная роля ў сказе?

Потым вучням прапаноўваецца выканаць тэкставыя практыкаванні.

**Работа з паэтычным тэкстам**

Выпішыце прыметнікі. Ці аднолькавыя формы ліку маюць прыметнікі? Якім членам сказа з'яўляюцца кароткія прыметнікі? У якой склонавай форме ўжываюцца? Як змяняюцца кароткія прыметнікі?

Зрабіце ўласныя высновы пра кароткія і поўныя прыметнікі.

1.Да разгарэлася каліна,
Дробны іскаркі ронячы.
Расплакалася дзяўчына,
Перад бацькам стоячы.
Сунімаў татачка, не суняў,
Большай жаласці надаў:
– Да дзіцятка маё любае!
Аддаю цябе ад сябе
У тыя людзі дзіўныя… [7]

2. Стаяла бяроза
Тонка да высока.
Гэй, гэй! Тонка да высока.
На корань глыбока,
На лісце шырока.

Пасля вучні чытаюць тэкст параграфа, рыхтуюць вуснае паведамленне: «Ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў».

**Работа з песенным тэкстам**

На экране дэманструецца тэкст песні «Цячэ вада ў ярок» у выкананні народнага ансамбля «Свята». Дзецям патрэбна выпісаць кароткія прыметнікі

разам з назоўнікамі, якія да іх адносяцца. Пасля праслухоўвання песні настаўнік арганізуе размову па пытаннях.

Якія прыметнікі ў песнях сустракаюцца часцей?

Як вы думаеце чаму? *(Адказы вучняў.)*

Паспрабуйце замяніць кароткія прыметнікі поўнымі. Ці губляецца каларыт і прыгажосць роднага слова? *(Так.)*

Вучні з дапамогай настаўніка прыходзяць да высновы, што кароткія прыметнікі ў сучаснай беларускай мове сустракаюцца рэдка і пераважна ў мове паэзіі. Народныя песні – цудоўныя паэтычныя творы, дзе кароткія прыметнікі ўдасканальваюць іх мастацкую форму.

**Заданне.** Сфармулюйце ўласнае заданне па тэме ўрока.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Маляўка, М. М.** Сядзіба, або Хата з матчынай душою / / М. М. Маляўка. – Мн.,2002. – С.12–16.
2. **Хандрыка, С. В.** Беларуская народная культура на ўроках роднай мовы // С. В. Хандрыка. – Мазыр,2007. – С.14–28.
3. **Бакуліна, Г. А.** Выкарыстанне комплексных інтэлектуальна-лінгвістычных практыкаванняў на ўроках мовы / Г .А.Бакуліна // Пачатковая школа. – 2003. – № 1 . – С.17–21.
4. **Бушыла, Н. В.** Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы / Н.В. Бушыла// Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 6. – С.16–18.
5. **Васюковіч, Л. С., Яленскі, М. Г.** Методыка выкладання беларускай мовы ў сярэдняй школе // Л. С. Васюковіч, М. Г. Яленскі. – Мн., 1999. – 176 с.
6. **Вярбіла, У. М.** Багата, родная ты мова // У. М. Вярбіла, Я. М. Лаўрэль, М. Г. Яленскі. – Мн., 1988. – 175 с.

7. **Каўрус, А. А.** Стылістыка беларускай мовы // А .А. Каўрус. – Мн., 1987. – 182 с.
8. **Ляшчынская, В. А.** Тэкст на ўроках беларускай мовы: практычны дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей ВНУ // В.А. Ляшчынская. – Мн., 1997. – С.145.